Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к. на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі.

Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцца назад.

Год VIII. 5 красавіка 1913 г. №. 14.

**Пры гэтым нумэры разсылаецца усім чытачом цэннік сельска-гаспадарскіх прылад на вясну 1913 году склада сельска-гаспадарскіх прылад Зыгмунта Нагродзкаго.**

## Перад згодай.

Прыпынілася крыху крывавая бойка на Балканскім поў-востраві. Пачалі людзі жупець аб тым, што хутка настане згода. І такі запраўды, мабыць, прыйдзе канец вайне. Цяпер абедзьве стараны і славянская і турэцкая падлічаюць свае страты, а стратам гэтым канца—меры не відаць. Доўгіе гады і дзесяткі гадоў пройдуць пакуль адбудуюцца зруйнаваные гарады, зазеленеюць нівы, а зруйнаваные людзі ізноў абжывуцца.

І не адны толькі балканскіе славяне с туркамі мелі страты ад гэтай вайны, а адбілася яна на жыцьці усіх эўропэйскіх гасударствоў і народоў. Бо ў нашы часы усе гасударствы, усе народы, як зубчатые калёсы у машыне звязаны с сабой і калі дзе у адным-двох калёсах якая здарыцца шчэрбіна, ці зазубрына, то гэта на усей машыне адбіваецца. А калі такое нешчасьце, як вайна людзей дзе спаткае, то на ўсім сьвеці гэта чуваць у промысле і торгу. Пачынаюць закрывацца, у прамысловых старонках фабрыкі, множыцца чысло безработных. А найбольш даецца у знакі тым старонкам каторые адсталі ад агульна—эўропэйскаго экономічнаго развіцьця, якіе збываюць свае ураджаі, або сырые прыпасы у чужые краі і з гэтаго маюць даход.

Вось гэткай атсталай старонкай, ёсць і наша Беларусь. Ня ўсё што вытвараем мы са сваей зямлі перэрабляем на гатовы тавар у сябе на мейсцы, а багата чаго ідзе сырым таварам заграніцу (зярно, скаціна, скуры і інш). Дык і балканская вайна адбілася вельмі на цэнах на нашы сырые тавары. Гэтак нізкіе цэны усю гэту зіму стаялі на збожжэ і лён. Цяпер перад вясной праўда, падняліся цэны на усе прадукты, але гэта беднаму хлебаробу на карысць ня йдзе, бо у восень ён усё ужо распрадаў, а цяпер вясной часта — густа прыходзіцца селяніну дакупляць дарагіх харчоў і скаціну.

У больш культурных старонках, дзе грамадзянскае жыцьцё ужо наладжэна, там гэткіе здарэньня не так крэпка адбіваюцца на жыцьці селян.

Калі наш селянін прадае сваё збожжэ і скаціну, то пакуль яна дойдзе да тых каторые спажываюць, паміж спажыўцом і вытварцом, нашым селянінам, стаіць доўгі рад розных фактароў-пасярэднікоў с каторых кожны зарабляе, і, само сабой, зарабляе на кішэні нашаго селяніна.

Вось-жэ пакуль у нас ня будзе па вёсках моцных селянскіх хаўрусоў, датуль кожнае здарэньне у міжнародным жыцьці будзе у першы чарод адбівацца на нас. Дзеля гэтаго усе павінны старацца шырыць між народам пачуцьце еднасьці, хаўруснасьці.

„Грамада—вялікі гмах“ — сказаў наш беларускі песьняр Я. Купала, але тады гэты вялікі гмах будзе сілай, калі ён будзе звязан цэмэнтам еднасьці і сьвядомасьці сваіх інтэрэсоў.

*Лішні.*

## „Не чапайце нашых“.

У думскай судовай камісіі было дужа характэрнае здарэньне. У часе, калі праглядалі праект рэформы (перастройкі) сэнацкіх дэпартамэнтоў, адзін с правых селян падаваў голас разам с поступоўцамі, затое, каб рэформа была расшырэна. Правые голасна загадалі селяніну сесьці. Дэпутат Головані заступіўся за селяніна, кажучы, што ніхто не мае права лезьці у сумленьне другіх і змушаць дэпутата падаваць свой голас ні так, як ён хочэ. На гэта правы дэпутат Новіцкі сказаў трудавікам, каб яны не падхадзілі да селян: „Не чапайце нашых, а мы вашых не зачэпім“. Геловані атказаў: „Вы не ў сваім маёнтку“. Селян Геловані паздаровіў з новым начальствам.

У гэтым здарэньні усё характэрнае—і той страх перад ўплывам трудавікоў, і той пагляд на селян, як на „нашых“ і „вашых“, бытцым на нейкую скаціну, каторая ні мае свайго розуму, ні сваей волі, а толькі здатная на тое, каб слухаць «гаспадара», хтоб ён ня быў.

Што датычэ думскіх селян, то праўду кажучы яны шмат у гэтым самі вінаваты, што правые лічуць іх нечым горшым эа сябе. Ужо адно тое, што ёсць правые селяне паказывае на нізкае развіцьце думскіх селян. Добра, каб паміж думскімі селянамі былі адны толькі „пузыры“ і „кулакі“, то прынадлежнасць іх да правых была б саўсім зразумела. Але да правых залічаюць сябе і такіе селяне, што толькі дзякуючы думскім 10 рублём штодзеннай платы не галадаюць, а ва ўсім іншым яны падобны да ўсяго гарапашнага селянства.

Але «шмат» гэта не значыць ешчэ «саусім». Палавіна селянскіх прэдстаўнікоў с самаго пачатку чацьвёртай Думы залажылі сваю грамадку. Гэта грамадка селян—дэпутатоў раз пораз прыпамінае сябе пры падачы галасоў у Думе. Ды і правые селяне робяць німала клопату сваім правым верхаводам. Гэтак відаўна правые селяне гатовы былі пакінуць сваіх верхаводоў затое, што тые пачалі старацца, каб распусьціць Думу. Толькі пасьля таго, як правые голасна сказалі, што справа аб роспуску Думы папала на павестку выпадкова па віне сэкрэтара правые селяне супакоіліся.

І не глядзя на ўсё гэта думскіе „правые“ далей гоманкі „не чапайце нашых“, далей пагляду на селян як на «хрышчоную ўласнасць» і дагэтуль не пайшлі. Навука і гісторыя прайшла міма іх, ніякаго сьледу у іхніх мазгах не пакінуўшы.

*Р.*

## У сваей хаці—свая сіла.

Пасьля часоваго заціхша ізноў ад нас, з нашаго краю, пачынаюць людзі цягнуцца на перасяленьне. Ізноў тысячы нашых выежджаюць за Урал, у Сібір, у невядомые ім стэпы, шукаць там лепшай долі, болей абаспечэннаго і шчасьлівейшаго жыцьця, чым тое, каторае маюць на бацькаўшчыне.

Што іх цяпер цягне туды?.. Калі цэлая людзкая рэка хлынула на сібірскіе землі пасля 1906 году, то кождаму было зразумела, што туды яго пагналі утрачэнные і разбітые надзеі на расшырэньня зямелькі у сябе дома. Усякі адчуваў, што уцекалі людзі з дому ад цяжкай крыўды, горкаго расчараваньня ў нязбытных думках.

І можэ быць гэта было і патрэбнае, бо нельга жыць гаротнікам без таго аганька надзеі, каторы сьвеціць ім у цяжкім жыцьці. Нельга ня мець заместа аднэй разбітай надзеі хоць чаго небудзь, што маніло-б чэлавека лепшым жыцьцём.

Зауральскіе мала каму вядомые, землі, акружэны былі старымі казкамі аб «зяленым кліне», дзе будзе усім зямлі у волю, дзе можна будзе жыць без пастаяннай думкі аб тым, што німа куды падацца, німа да чаго прылажыць свае рукі. Аб усіх гэтых сібірскіх стэпах думалося як аб нейкім бязмерным моры вольнай зямлі, куды можна людзям ісці і сяліцца усюды, дзе толькі знойдуцца варункі, блізкіе да нашых, бо ўсё-ж такі і тады кожны селянін у душы адчуваў, што свая бацькаўшчына дарога яму, што лягчэй было-б жыць у падобнай да Беларусі старонцы

Але ад таго часу мінула ужо шэсць год.

Мы цяпер дужа добра ведаем, што усе гэтые гутаркі аб „зяленым кліне“ адно только казкі, што і у Сібіры вольнай зямлі, годнай да таго, каб вясьці гаспадарку, падобную да нашай, ужо блізка што саўсім німа, што там больш 3 мільёноў людзей ешчэ німаюць ніякаго прытулку, што на тое, каб прыстроіцца у Сібіры, так, што можна было-б падобна да людзей жыць, патрэбна многа грошы.

Мы ня толькі гэта ведаем. Мы сваімі вачамі бачылі тысячы нешчасьлівых вярнуўшыхся адтуль зруйнаваных людзей, каторые страцілі там усё, што яны мелі, а пасьля вярнуліся у Бацькаўшчыну, каб хоць тут памерці каля дзедаўскіх і бацькаўскіх магілак.

І вось не глядзя на ўсё гэта, ізноў у гэты бок цякуць селянскіе думкі. Ізноў цягнуцца партіі хадакоў, а за імі пойдуць і грамады вясковых людзей на голад і холад у чужую, дзікую старонку.

Апрача бязмернаго гора, страты людзей, каторые ёсць глаўным і найбольш дарагім багацьцем краю, апрача непатрэбнай растраты сіл і дабра, гэтае ізноў узрастаючае перэсяленьне у Сібір робіць ешчэ адну вялікую шкоду у жыцьці нашаго краю.

А гэта шкода у тым, што думкі і надзеі нашаго селяніна адлетаюць ад таго, што робіца у яго перэд вачамі. Ен не глядзіць кругом сябе, а некуды у даль, дзе яму здаецца, што знайдзе лепшые варункі жыцьця. Ен перэстае працаваць і думаць аб тым, як направіць, як лепей наладзіць сваё жыцьцё тут, у сваей старонцы, а думае аб тым якое шчасьце недзе далёка чэкае яго. Дома пачынае ён чуцца госьцем. Яму здаецца, што тут ён жыве да часу, а акуратнае, крэпкае жыцьцё пачнецца, недзе у далёкай, шчасьлівай старонцы.

Калі гэткаму чэлавеку гаварыць аб падняцьцю гаспадаркі, аб хаўруснай дружнай працы, аб земствах, аб Думе, то ён усё гэта гатоў адным вухом прыймаць, а другім выпускаць. Бо ўсё гэта патрэбна тым, хто астанецца тут, дома, і саўсім безкарыснае таму, хто бытцым знайшоў лепшы выхад.

Тым часам, калі мы прыгледзімся да жыцьця у другіх старонках, каторые патрапілі перэбудаваць сваё цяжкое жыцьё так, што цяпер ім жывецца і сыта і радасна, то убачым, што найшыбчэй у іх ішла работа тады, калі яны пачыналі думаць і працаваць перш за ўсё над тым, што было кругом іх.

Накіравала іх гэтак сама, як і у нас, тая-ж цесната, ад каторай мы уцекаем на край сьвету. Але яны яе не пабаяліся, бо зразумелі што з бядой трэба дома змагацца і шукаць на яе спосабоў дома.

Яны знайшлі гэтые спосабы і думаю, што знойдзем і мы іх, калі толькі будзем шукаць гэтых спосабоў дома, дзе „свая праўда“ а не там дзе мы заўсёды будзем чужымі.

*К. Мацеевіч.*

## Беларусь будзіцца.

Самае важнае, што зразумела апошнімі часамі беларуская вёска—гэта карысьць і патрэбу хаўруснай, супольнай працы.

Паверные (крэдытовые) тавар ыствы, харчавые крамы, трудавые арцелі, гэта усё навінкі аб каторых 3—4 гады таму назад нашы селяне і ня думалі, а цяпер яны становяцца тым цэнтрам каля катораго кружацца усе надзеі адраджаючэйся беларускай вёскі.

Вялікую ролю у справе прабуджэньня вёскі сыйгралі сваімі дужа круцельскімі справамі вясковые дзяльцы. Селяне у канцы раскумякалі усё зло якое робяць вёсцы гэтые дзяльцы-прайдохі і зразумелі, што толькі дружная хаўрусная праца можэ паправіць цяперэшняе палажэньне.

— „Устроім так, каб самім збожжа заграніцу атпраўляць—годзі нажывацца скупшчынам на нашым гарбу“.

«Німа што у працэнтчыка грошы браць, пара і свой банк аткрываць»,—гэткіе гутаркі ўсё часьцей і часьцей прыходзіцца чуць ад селян.

У большай часьці селяне ад слоў пераходзяць да дзела.

У нашым павеці (Быхоўскі Могіл. губ.) стараньнем і працай селян аткрыта шэсць крэдытных таварыств (Быхоўскае, Дашкоўскае, Прапойскае, Лудчыцкае, Чорнагразскае і Чыгірынскае), чатыры харчавые крамы (Быхоўская, Доўгамохская, Дашкоўская і Грудзіноўская) і адна трудовая арцель (у Быхаве).

Трэба адмеціць тое, што за увесь час ні ў вадным с пералічэных хаўрусоў не было ніякіх каламут; селяне да хаўрускай працы адносяцца чэсна, цьвяроза і разумна.

Першымі явіліся у вёсцы крэдытовые таварыствы. Недахват паверу (крэдыту) было адвечнай прычынай усіх нешчасьцёў і злыбяды для селяніна-беларуса. Недахват паверу прымушало не ў час прадаваць свой ураджай, гэты недахват прымушаў часта - густа селяніна вясьці на торг апошнюю каравёшку і недахват грошы кідаў селян у прагавітые лапы працэнтчыкоў.

Паверные таварыствы зруйнавалі адразу усю хітрую машыну пастак і сілкоў, у каторые спрытные дзяльцы заманывалі бедных і цёмных людзей у час цяжкой патрэбы.

Шпаркасць, з якой дробненькіе таварыствы с капіталам у 2—3 тысячы рублёў перэварачываюцца за самы кароткі срок у вялікіе прад-

# Аб усім па троху.

### Работы селянскаго банку у віленскай губэрні.

У прошлым гаду селянскі банк у віленскай губэрні разбіў 12,000 дзесяцін зямлі на 300 хутароў. Цяпер на гэтые хутары банк шукае пакупцоў. Летам, гэтаго году, банк разабье на хутары ешчэ 20,000 дзесяцін. Найбольш работы будзе банку у ашмянскім павеці, дзеля таго, што банк купіў маетнасць „Бярозына" ад графа Корвін-Мілеўскаго. Маетнасць мае 9,600 дзесяцін, у гэтым 5,600 дзесяцін найлепшаго лесу. Лес будуць рубаць толькі на 1,600 дзесяцінах, а рэшта астанецца на пню і будзе заведзена лесная акуратная гаспадарка. Апрача гэтаго банк мае 4,700 дзесяцін у ашмянскім павеці купленых у Крэзынскаго і Беклямішэва. Гэткім парадкам у ашмянскім павеці разбіта будзе на хутары 10,300 дзесяцін зямлі.

У дзісенскім павеці на разбіўку назначэна 3,400 дзесяцін з маетнасцей князёў Любомірскіх, купленых банкам у леташнім гаду.

У паветах віленскім, свянцянскім і троцкім банк на разбіўку мае зямлі ні так многа.

Хто хочэ купіць ад банку зямлю павінен загадзя аб гэтым напісаць у банк.

### Ваенная павіннасць у 1913 гаду.

С прычыны новай ваеннай уставы міністэрства ўнутрэнных спраў паведамляе усіх, хто записаўся па старой уставе у призыўны участкі, што асобы, каторые радзіліся у часе ад 1 кастрычніка да 31 сьнежня 1892 году, павінны адбываць ваенную павіннасць ня у 1914 гаду, як записана у іхніх паперах, а павінны станўць на прызыў у 1913 гаду. Хто хоче скарыстаць з атсрочкі на навуку, ці на што іншае, каб не было негатрэбнай з гэтаго цяганіны павінны рабіць аб гэтым старэньня загадзя.

---

# Як перахадзіць на хутары.

На запытаньне некаторых чытачоў «Н. Н.» як перэхадзіць на хутары, мы можэм сказаць, што хаця пры хутарах зямлі не прыбываець але калі пры гэтым вёска можэ дакупіць зямлі, то з хутароў можэ быць значная карысць. Калі толькі хоць адна пятая часць гаспадароў вёскі захочэ, каб іх выдзелілі на хутары асобые ад усей вёскі, то яны могуць напісаць адкрытку у вуезд у землеустраіцельную камісію, тагды павінен прыехаць член і ім усё вытлумачыць, калі яны выйдуць на «палявую» зямлю, то іх сялібы бярэць вёска, а за гэта ім прырэзаець поля. Сялібнай зямляй могуць ешчэ карыстаць 3 гады.

Каморнікам, што нарэзаюць зямлю нічога ня трэба плаціць, ім трэба даць кватэру з апалам, падводы і работнікоў цягаць лавцугі. Грошы хутаранам пазычаюцца банкам на лёгкіх варунках і агрономы дарма тлумачаць, як трэба лепш гаспадарыць.

# З Беларусі і Літвы.

## Вільня.

### Сьмертны прысуд.

Віленскі ваенны суд разглядаў пры зачыненых дзьверах справу салдата лятучаго отраду у Лідзе, Формана, абвінавачэнаго у тым, што ён забіў афіцэра Похойкіна. Прычынай убійства было тое, што Похойкін не пазволіў Форману пайсьці на шпацэр па гораду. Ваенны суд прысудзіў Формана на кару сьмерці. Камандуючый віленскім ваенным округам пастанаўленьне суда зацьвердзіў і Формана перавёзшы у Ліду—перад усім гарнізонам разстрэлялі.

### Здзічэньне.

Адзін с тутэйшых хлопцоў (в. Крэменец, Хаченчыцкай вол. Вілейск. пав.) прыйшоў да шынкаркі, дзе, ведама, прывыклі правадзіць часіну як старые, так і маладые, і тут засеў у карты гуляць. Ці доўга там цягнулася гульня, ці не, добра ня ведаю, але не ў забаве прышлі ешчэ тры крэмянецкіе хлопцы, ворагі першаго. Яны уходзячы пачалі уведамляць усіх, што некаму сёньня будзе «гроб», без катораго тыкі і праўда не абышлося, бо хлопцы зараз-жэ пачалі завадзіцца маючы усе тры па нажу у руках і па каманю. Першы відзючы, што тут дрэнна рада, пачаў прасіць, каб білі але толькі каменямі, а нажы каб пахавалі. Але сам напрасіўся, бо хлопцы зрабілі «не так як ты, але так як мы хочэм», і пачалі дзяўбсці з усіх бакоў нажамі. Бедак пробаваў вырабляцца але разбойнікі дакончылі яго сапануўшы нажом пад жэбры, так, што паказаліся лёгкіе. Усіх ран зрабілі да дзесяці у розных мейсцах. Павядомлены ураднік прыляцеў скора, але злавіў толькі аднаго. а два другіе, злодзіі, схаваліся. Хлопец памёр праз гадзіну, хоць былі ужо пазашываны усе раны хаценчыцкім фэльчэрам.

І як тут ня крыкнуць с Цыцэронам „O tempore, o mores!" Адзін аднаго без уселякае літасьці рэжуць.

Пакайся людзе!
Дрэнна будзе
За кроў братоў прад Богам...

*Ф. Красоўскій.*

### Кража грошы у валасьці.

Гэта было на прошлым тыдні—перад Благавешчэньнем У мястэчку Празароках (Віл губ. Дзіс. пав.) сын каўбасьніка Грыдюшчонак, памочнік валаснога пісара, вечэрам, ужо зьмэркаючыся, калі пісар лёг атдыхаць, а старшына пайшоў у мястэчка; тады гэты Грыдюшчук, даўшы некольки капеяк, паслаў сторожа у мястэчка за булкай, а сам, падабраўшы ключы улез у старшынову скрынку у каторай былі ключы ад сундука у каторым складаюцца казённые—валасные грошы улез у гэты сундук і узяў 127 рублёў і запаліў воласць. Ажно скора прыходзіць старшына і адразу палез у сваю скрынку узяць грошы. Атчыніў скрынку аж бачыць німа валасных ключоў. Старшына тады барджэй, як мага разбудзіў пісара ды тутка-ж паляцелі у канцэлярыю агледзілі, што німа грошы і тутка-ж пачулі гар. Яны і туды і сюды, ці не гарыць дзе што. Адледзілі усюды і у хлявох ці не закінуў хто агня. Глядзяць ажно у страсе агонь. Пісар са старшыной адразу зьмякнулі, што гэта паўна іх памочнік (бо і уперод прапада 120 руб., за што земскі і старшыну зьмяніў), тады пісар скрозь ноч папёрся у Дзісну да спраўніка. Прыляцеў спраўнік, урадьнік і стражнікі перэтрасьлі Грыдюшчонка і знайшлі у яго толькі усяго 27 рублёў, а тые грошы кажэ падзялілі старшына са сторажам-бо мы усе гэта рабілі у трох. Павязаўшы Грядюшчонка і стоража атправілі стражнікамі у Дзісну. Тым часам урадник адумаўся, што ня добра перэтрасьлі,—паслаў у здагон стражніка. каб іх вярнуць. Стражнік нагнаў іх ужо аж у Язьні, за 15 вёрст. Калі вярнулі і перэтрасьлі лепей, то у Грындюшчонка знайшлі зашытых на рэмяні у партках і рэшту 100 рублёў. Калі пачалі рабіць спіскі (пратакол) уся паліція атхінулася, тымчасам Грындюшчонак наўцекі, ды некуды дзецца, дык у студню тапіцца, а студня была не зусім глыбокая, ды і стражнікі скора наляцелі і зачапіўшы круком за вяроўку, каторай ён быў звязаны, выцягнулі. Грындюшчонка адвялі у Дзісну.

*Леанард Касінскій.*

### Пярун.

На Благавешчэньне у вёсцы Застарыні (Дзіс. пав.) пярун запаліў хату, Згарэла хата і многа чаго, што было у хаці, людзі уцалелі. Прайшоў дужа вялікі дождж, што перапоўніліся усе канавы і лужы.

*Л. К.*

### Карова на Лятучым Пузыры.

Чаго дачэкаемся у канцы дваццатаго веку, калі ужо у пачатках яго пачынаюць лётаць на балёніках у паветры каровы? І то ня дзе небудзь у хітрых немцоў, а у нашай Беларусі, у слаўным акадэміцкім месьці Смаргонях. Было гэтае здарэньне на кірмашы у сяродпосьце. Селянка з акалічнай вёскі павела прадаваць на кірмаш у Смаргоні карову. Дома ураілі прадаць карову за 35 рублёў, але на кірмашы пашэвціла і за карову бабі заплацілі 38 рублёў. Тры рублі больш чым спадзевалася кабеціна. Узяўшы грошы радая баба думае, што-б тут такога купіць сваім дзеткам гасьцінца? А на гэты кірмаш прывязлі нейкіе злыдні на пакусу добрым людзям цэлую гару чырвоных, сініх і зялёныя балёнікоў, ці як іх тут празвалі лятучых пузыроў. Дай, думае сабе баба, куплю лятучы пузырок дзеткам. Заплаціла грыўню, а каб „лятучы пузыр" ня ўцёк, прывязала яго да хустачкі. Ідучы неяк загледзілася на нешта і выпусціла з рук хустачку, пузырок рвануўся і паляцеў у гару. І цэлая грамада кірмашоўцоў, як апосталы пры прэабражэньню Хрыстовым на гарэ Тавор, узіраліся, разам з бабой, як на пузыру ляцела развеваючыся хустачка у каторай у вузялок былі завязаны грошы за карову. Пузырок, доўга плыў усё вышэй і вышэй у гару, пакуль саўсім не прапаў з вачэй уносячы кароўку у няведомую даль. Бедная цётка плачучы і нарэкаючы на чартоўскіе выдумкі пашла дамоў бяз грошы, без кароўкі без гасьцінца дзеткам.

*С.*

---

## Мінск.

### Выбары у гарадзкую думу.

„Безпартійный" (Янчэўска - Амброшкевічоўскі) камітэт закончыў сваю работу: уложэнный з 27 на 28 марца спісак кандыдатоў у гласные, абвесьцілі толькі.. 31 марца. Са спіска выкінулі усіх найбольш апазыціонных, каторые кіруюцца да аднаўленьня гарадзкой гаспадаркі. Адвакат Івашкевіч (паступовец) трапіў усяго только у кандыдаты. Але затое узмацавалі цэнтр, як яго у Мінску называюць «панская хаўрузія», каторая давела горад безмала да банкроцтва (горад мае ужо каля 4.000.000 руб. доўгу).

Выбары гласных у Думу на 1913—1917 год. адбудуцца у гарадзской управе 4 красавіка.

### Судовая справа.

На 28 марца была назначэна у акружным судзе справа протоерэя Паўскаго з газэтай «Рѣчь», за карэспандэнцію з Мінска аб пагромных прамовах Паўскаго на банкеці у сьвяшчэнніка Шэнца.

Справа адложэна с тэй прычыны, што не ўручылі павесткі сьведку са стараны «Рѣчы»—вікарному епіскопу гор. Одэссы (быўшаму Мінскаму) о. Іоану.

Характэрна, што са стараны о. Паўскаго не явіўся на суд гаспадар банкету о. Шэнец. Прычына: «выезд з гораду».

Гэтаму суду, распачатаму пад ўплывам сыноду прыдаюць у мейсцовых духоўных кругах вялікае значэньне.

---

Тацяна сядзіць на берэзі сажалкі, з мокрымі русымі валасамі, з босымі нагамі, запэцканымі сажалкавым глеем. Яна падставіла твар і грудзі гарачым праменям сонца, і, здаецца, асалода разлілася па ўсім яе маленькім, і гожым стане.

— Аткуль ты, Тацяна?

— С падзённае... буракі матыкавалі. Але-ж пячэ вельмі,—гаворыць яна гультайна і паважна.

Маўчым колькі часу. Тацяна лажыцца плечамі на гарачую зямлю, я гляджу паўзлог на абрысы хатак, з лахматымі стрэхамі на смешныя бязсільна павіслые крылля мельніцы там ўдалёк, сярод блакітнаго паветра.

— Цябе, кажуць, гэтымі днямі балюча білі?

— Ну, от ешчэ! Хто мяне пасьмее біць? Яна прыпадымаецца на локці, глядзіць на мяне і кажэ с пагардаю;

— Не радзіўся йшчэ той чалавек на божым свеці, што пасьмее мяне біць.

Але-ж мне казалі. На вёсцы, бач, не схаваешься. Пра ўсе жупяць.

— Так, гэта мяне бацька біў!—гаворыць яна спакойна.—Ун і цяпер ешчэ сіняк каля леваго вока. Здурнеў стары чорт ад бабскай жупні ды цкаванёў, і пачаў біць...

— За што-ж ён цябе біў?

— Ды за Петрыка. Мо, знаеце Петрыка? Ен ешчэ гэтымі днямі да вас прыхадзіў. Ну, от, з ім, з Петрыкам, я й пайшла. Пайшла з ім гуляць вечарам, а вярнулася раніцаю. Толькі усяго й было.

— Ты, што-ж за яго замуж. пойдзеш?—спытаўся я.

Тацяна засмеялася.

— Гэта за Петрыка? Не ні пайду. Ды яго цяпер восеньню ў маскалі бяруць. Годзі яму па вёсцы з дзеўкамі дурэць. Там ўжо, у салдатах, годзі... Шкода яго Петрыка. ўсе-ж...

Яна замоўкла і ізноў легла на спіну, купаючыся ў гарачых праменях. Маладые цвёрдые грудзі яе чуць-чуць ўздымаліся; с пад апушчэных доўгіх век бліщчаў загадкаю шэранькі агеньчык. Аб чом яна думала тымі хвілінкамі?

А цябе, Тацяна, так сама шкадуюць—запытаў я.

— Не,—сказала яна проста і ўстала. Цяпер яна стаяла ў--ва—весь рост, статная і пекная, з дэлікатнымі абрысамі душэўнаго твару. Чулося, што гэта вялікая сіла поўная чуцьця, заўсёды родзячая любоў і кіруючаяся к ад вечнай волі...

— Нас не шкадуюць... Гнуць нас работаю і голадам. Замужам жыць маркотна. Пойдуць дзеці галодные ды саплятые... Увесь свой век бьюцца кабеты, як рыба аб лёд, а самі злюхі-раззлюхі, места сабе ні знаходзяць, ходзяць як дурные. Туды ім і дарога, і шкадаваць іх не варт... вы бабам ні давайце веры і не шкадуйце. Бо брэшуць яны ўсе і самі ад брахні і мучацца... Толькі нам жыць, покуль мы вольные ..

Праставалосая і бадай голая, са сваёю простаю моваю, мокрымі, русымі валасамі. Уся залітая сонцам,—яна сама здавалася мне цяпер выяваю волі. Але, гэта была яна, безгранічная воля якой няможна паказаць дарогі, простай, і адвечнай, як і сама прырода. І чэлавек рупіўся паказаць яму дарогі і хацеў дакانацца недакананаго... даўно, вельмі даўно... Ешчэ ў громе і маланках Сынаю грымелі сярдзітые уставы і на каменных дошках Божы палец пісаў конституцію чуцьця...

І Тацяну будуць катаваць і біць да сьмерці без жалю, пакажэ яна сіняк каля леваго вока і ўсё ж, разам са сваею прыродаю, будзе гарачым уззывам к маладому, сьпеламу і вольнаму шчасьцю...

Масква

18 марта 1913 г.

Пераклаў **Наз. Бываеускі.**

